БИБЛИОТЕКА
БГУ

www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта
1 верасня 2008 года, № 13 (1985)

## З ДНЁМ ВЕДАЎ!

*Дарагія сябры!*

*Віншую універсітэцкае супольніцтва з пачаткам новага навучальнага года!*

*Для ўсіх нас гэта радасная і хвалюючая падзея. Але найбольш асаблівая яна для першакурснікаў, якія пачынаюць зусім новы перыяд жыцця. Мы рады вітаць нашых юных сяброў і спадзяёмся, што кожны знойдзе сваё месца ў вялікім доме, які завецца БДУ, і сваімі ведамі і талентамі зробіць якасны ўнёсак у славу альма-матэр.*

*Як кожны з нас ганарыцца тым, што з'яўляецца часткай БДУ, так і універсітэт ганарыцца кожным! Наперадзе новыя справы і штодзённая карпатлівая праца. Універсітэт мае трывалы падмурак і вялікія планы для далейшага развіцця. Жадаю ўсім поспехаў, творчых здзяйсненняў, моцы і добрага настрою!*

*Будзем разам, і ўсё ў нас атрымаецца!*

***Рэктар прафесар В.І.СТРАЖАЎ***

ВІНШУЕМ!

## ПАШАНА СТАЛІЦЫ

За шматгранную і плённую навукова-педагагічную дзейнасць па падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў, значны асабісты ўнёсак у развіццё і ўдасканаленне сістэмы вышэйшай адукацыі рэктар БДУ прафесар Васіль Стражаў атрымаў падзяку ад старшыні Мінгарвыканкама Міхаіла Паўлава, а прарэктар па адукацыйных інавацыях і інфармацыйных тэхналогіях дэкан ФПМІ Павел Мандрык – ганаровую грамату Мінскага гарадскога савета дэпутатаў.

Падзякамі сталічнага мэра за высокія дасягненні ў падрыхтоўцы навучэнцаў агульнаадукацыйных устаноў да рэспубліканскіх і міжнародных алімпіяд, канферэнцый і конкурсаў, плённую творчую працу з адоранай моладдзю адзначаны таксама Ігар Варановіч, Барыс Задворны, Наталля Арол, Ірына Ратнікава, а Сяргей Мазанік ганараваны падзякай ад Мінгарвыканкама.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

**СЁННЯ Ў НУМАРЫ:**

**У БДУ ПРЫЙШЛІ САМЫЯ ЛЕПШЫЯ!**

**Пра вынікі ўступнай кампаніі–2008 распавядае адказны сакратар прыёмнай камісіі БДУ Людміла ХУХЛЫНДЗІНА**

**Стар. 2**

**ШКОЛА ПЕРШАКУРСНІКА**

**Стар. 3–4**

ВЕДАЙ НАШЫХ!

## НЕВЫПАДКОВЫ ПОСПЕХ

***Студэнты нашага універсітэта ў чарговы раз паспяхова выступілі на 15-й па ліку Міжнароднай студэнцкай матэматычнай алімпіядзе (IMC), якая прайшла з 25 па 31 ліпеня ў Благоеўградзе (Балгарыя).***



*Дзмітрый Базылеў (у цэнтры) разам са сваімі падапечнымі.*

У сёлетнім турніры брали ўдзел студэнты больш чым 90 універсітэтаў з 33-х краін. У выніку каманда БДУ заваявала 3 залатыя і 1 сярэбраны медаль і заняла ў неафіцыйным агульнакамандным заліку 7-е месца. "Золата" атрымалі студэнты факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі Руслан Максімаў (III курс) і Павел Іржаўскі (IV курс), а таксама іх таварыш з механіка-матэматычнага факультэта Іван Блізнец (III курс). Сярэбраным медалём узнагароджаны Дзяніс Каляда (II курс ФПМІ). Кіраваў камандай намеснік дэкана ФПМІ дацэнт Дзмітрый Базылеў.

4 жніўня на пасяджэнні прыёмнай камісіі нашых пераможцаў павіншаваў рэктар БДУ прафесар Васіль Стражаў. Дарэчы, пачынаючы з 2001 года за час удзелу ў гэтых прэстыжных сусветных спаборніцтвах студэнты альма-матэр заваявалі 29 залатых, 19 сярэбраных і 5 бронзавых медалёў.

**Надзея КЛЕМЯНЦЁНАК**
**Фота Аляксандра СНАПКА**

ПЕКІН-2008

## БДУ "ПАБРАНЗАВЕЎ"

***Толькі што адгрымелі галоўныя спартыўныя спаборніцтвы апошняга чатырохгоддзя. Алімпіяда ў Пекіне вызначалася беспрэцэдэнтным размахам і феерверкам найвышэйшых дасягненняў атлетаў. Вельмі прыемна, што да папаўнення рэкорднай медальнай скарбонкі беларускай зборнай спрычыніліся і студэнты нашага універсітэта. "Грэка-рымскі" барэц Міхаіл СЯМЁНАЎ здабыў бронзавы медаль у катэгорыі да 66 кг, і ўзнагароду такой жа вартасці атрымала Надзея АСТАПЧУК у кіданні ядра.***

У той час, калі Надзя Астапчук – ужо даўно вядомая і тытулаваная спартоўка, Міхаіл Сямёнаў – будучае айчыннага спорту. Яго медаль "каваўся", як гаворыцца, "потам і крывёю" ва ўпартым змаганні. Атрымаўшы адну за другою дзве перамогі па ачках на старце турніру, Міхаіл сутыкнуўся з віцэ-чэмпіёнам свету 2007 г. французам Стывам Гено.

Наш атлет на роўных вёў схватку са знакамітым візаві, але мусіў саступіць у двух перыядах (1:2, 1:1). Дзякуючы таму, што француз прабіўся ў фінал, Сямёнаў патрапіў у суцяшальны турнір, які правёў як мага лепш. Напачатку быў пераможаны кубінец Міліян Бургас. Паядынак жа за бронзу з казахам Дарханам Баяхметавым працякаў драматычна. Прайграўшы стартавую дзвюххвілінку (1:2), Сямёнаў захаваў прысутнасць духу і няспынна атакаваў, што і прынесла дывідэнды (2:1, 3:1). Перад тым, як аб'явіць пераможцу, суддзі ўважліва праглядалі відэазапіс, відавочна, правяраючы, ці быў прыём праведзены на дыване альбо за яго межамі. У выніку рэферы ўскінуў руку 24-гадовага студэнта гістфака БДУ. Ёсць бронзавая ўзнагарода!

Цешыць, што беларус з чатырох перамог тры атрымаў у трэцім вырашальным перыядзе, то бок праявіў выдатныя маральна-валявыя якасці. Вось што распавялі ў інтэрв'ю "Прэсболу" дзяржаўны трэнер па грэка-рымскай барацьбе Анатоль НОВІК і старшы выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту БДУ, адказны за спартыўна-масавую работу на гістарычным факультэце Васіль ЮШКО.

А. Новік: "Міша Сямёнаў спасцігаў азы барацьбы ў сталічнай СДЮШАР № 7, а затым у Рэспубліканскім вучылішчы алімпійскага рэзерву. Пасля заканчэння РВАРа Сямёнаў паступіў на гістарычны факультэт Белдзяржуніверсітэта. Трэба сказаць, што ў галоўнай ВНУ краіны даўнія барцоўскія традыцыі. Тут з поспехам працавалі заслужаны дзеяч фізічнай культуры, у мінулым чэмпіён Спартакіяды народаў СССР Віталь Фяфёлаў, заслужаны трэнер СССР Віктар Руданкоў. Зараз іх справу працягвае выхаванец Руданкова, выпускнік юрыдычнага факультэта БДУ, дацэнт кафедры фізвыхавання алімпійскі чэмпіён Камандар Маджыдаў. Калі Камандар Бафаліевіч сканцэнтраваў увагу на нацыянальнай камандзе, частку працы ўзяў на сябе Мікалай Прусаў. Але менавіта стасункі з Маджыдавым, выбітным атлетам і спецыялістам, на мой погляд, сталі для Сямёнава вызначальным фактарам у плане спартыўнага ўдасканалення".



*На п'едэстале: бронзавы прызёр Алімпіяды–2008 Міхаіл Сямёнаў.*

В. Юшко: "Міхаіл Сямёнаў скончыў тры курсы дзённага аддзялення нашага факультэта. Мы разумеем, што сумяшчаць вучобу і трэніроўкі спартоўцу высокага класа цяжка, таму распрацавалі для яго індывідуальны графік наведвання заняткаў. Міша – выключна сумленны, акуратны, годны хлопец. Калі што абяцае, абавязкова зробіць – чалавек слова! Хоць яму нялёгка вучыцца старанна, без запазычанасцяў. У нашай ВНУ ёсць цудоўная традыцыя – кожны год вызначаць найлепшага спартоўца БДУ. У 2007 годзе гэтае званне было прысуджана Міхаілу Сямёнаву".

Увогуле, удзельнікамі сёлетніх Алімпійскіх гульняў сталі пяць студэнтаў нашага універсітэта. Акрамя згаданых асоб, гэта яшчэ студэнт факультэта міжнародных адносін Максім Мірны (тэніс), студэнт эканамічнага факультэта Станіслаў Неўроўскі (плаванне) і студэнтка юрыдычнага факультэта Анастасія Новік (лёгкая атлетыка, кіданне кап'я).

**Падрыхтаваў**
**Сяргей ШАФАЛОВІЧ**

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

# У БДУ ПРЫЙШЛІ САМЫЯ ЛЕПШЫЯ!

***Гэтым летам студэнтамі нашага універсітэта сталі больш за 6 тысяч абітурыентаў. Мы папрасілі ахарактарызаваць новы кантынгент і ў цэлым падвесці вынікі ўступнай кампаніі–2008 адказнага сакратара прыёмнай камісіі БДУ Людмілу ХУХЛЫНДЗІНУ:***



*Пераможцы міжнародных алімпіяд школьнікаў па матэматыцы, хіміі і біялогіі атрымалі студэнцкія білеты на пасяджэнні прыёмнай камісіі ўжо 30 чэрвеня 2008 года.*

– Вынікі сёлетняга прыёму даволі добрыя. Мы набралі моцных абітурыентаў. Аб гэтым сведчыць конкурс, які быў на прыродазнаўчых факультэтах (для гуманітарных факультэтаў гэта звычайная з'ява). Пры гэтым адзначым, што конкурс у апошнія гады ўжо не з'яўляецца вызначальным паказчыкам, паколькі ва ўмовах цэнтралізаванага тэсціравання ён і не можа быць высокім. Папярэдне здаўшы неабходныя ЦТ, абітурыенты загадзя маюць на руках тры сертыфікаты і ведаюць сваю суму балаў. Калі яны сочаць за падачай дакументаў, то могуць ацаніць свае магчымасці і пайсці на тую спецыяльнасць, дзе для іх складваецца найбольш спрыяльная сітуацыя. Між тым, у адрозненне ад мінулага года абітурыенты, якія першапачаткова вырашылі паступаць на платную форму навучання, гэтым разам не былі абавязаны ўдзельнічаць у конкурсе на бюджэт. Адсюль, калі гаворка ідзе пра конкурс на мехмат у 1,7 чалавека на месца, на ФПМІ крыху ніжэйшы – гэта сапраўды добры паказчык. Бо сюды ішлі матываваныя хлопцы і дзяўчаты.

Улічваючы гэтыя абставіны, галоўным крытэрыем якасці прыёму на сёння з'яўляецца прахадны бал. А ён у гэтым годзе для тых, хто пастулае на бюджэтныя месцы, апынуўся ў нас значна вышэйшы, чым у сярэднім па рэспубліцы. Дарэчы, Міністэрства адукацыі падчас цэнтралізаванага тэсціравання зніжала мінімальны парог станоўчай адзнакі па ЦТ з улікам падрыхтаванасці абітурыентаў. Скажам, па матэматыцы і фізіцы да 8, па рускай і беларускай мовах да 13 балаў. На нашым жа ФПМІ, напрыклад, прахадны бал быў роўны 314 за тры іспыты плюс бал атэстата. Гэта значыць, што па кожным прадмеце трэба было набраць у сярэднім па 75 балаў. Сюды, як вы разумееце, уваходзяць і фізіка, і матэматыка, і руская мова. Такія вынікі не могуць нас не радаваць.

Апрача таго, доказам добрага ўзроўню нашых абітурыентаў з'яўляецца і высокі сярэдні бал школьных атэстатаў. Канечне, гэты параметр ва ўмовах, калі ён грае дастаткова сур'ёзную ролю пры паступленні ў ВНУ, школы могуць крыху завышаць. Але ў той жа час усе апынаюцца ў аднолькавых умовах. Сярэдні бал тых, хто падаў заявы на паступленне, летась склаў 8,5, а ў гэтым годзе – ужо 8,7. Самае цікавае, што сярэдні бал залічаных па універсітэце – 8,9. На ФПМІ ён дасягнуў 9,3 (бюджэтная форма навучання), на факультэце міжнародных адносін – 9,4. Па гэтым паказчыку мы таксама лідары сярод ВНУ. Наша вядучае становішча пацвярджае і тое, што з 270 пераможцаў рэспубліканскіх алімпіяд 124 паступілі ў БДУ. То бок практычна 50% гэтых таленавітых юнакоў і дзяўчат абралі наш універсітэт. 6 з іх з'яўляюцца пераможцамі міжнародных алімпіяд (3 чалавекі па матэматыцы і па адным па хіміі, фізіцы і біялогіі).

**– З чым звязваеце такі якасны набор і ажыятаж вакол БДУ?**

– Наш універсітэт – вядучая ВНУ і агульнапрызнаная школа падрыхтоўкі спецыялістаў найвышэйшага класа. Таму найлепшыя абітурыенты ідуць менавіта сюды. Да таго ж, у гэтым годзе была прафесійна праведзена прафарыентацыйная работа. Нашы прадстаўнікі аб'ездзілі ўсе без выключэння раёны Мінскай вобласці, дзе сустракаліся са школьнікамі, звяртаючы ўвагу найперш на профільныя класы. Таксама актыўна дзейнічалі "школы юных" нашых асноўных прыродазнаўчых і некаторых гуманітарных факультэтаў. Усе вучэбныя падраздзяленні правялі "школы абітурыентаў", у рамках якіх моладзь здолела не толькі паўдзельнічаць у алімпіядах, але і асабіста пазнаёміцца з факультэтамі, пабываць у лабараторыях. Двойчы ў навучальным годзе праводзіліся Дні адкрытых дзвярэй, а яшчэ адбылася сустрэча з абітурыентамі ў маі. Гэтыя намаганні і далі такія добрыя вынікі.

**– Чым адрозная арганізацыя ўступнай кампаніі ў гэтым годзе?**

– Сёлета асаблівасцю працы прыёмнай камісіі стаў яе ранні пачатак. Яна цягнулася паўгода, з 5 сакавіка па 5 жніўня. Увявіце толькі: больш за 18 тысяч абітурыентаў зарэгістраваліся на ЦТ менавіта ў нас, а ўдзельнічалі 17 тысяч. І прафесійна-псіхалагічнае сумоўе большасць жадаючых таксама праходзіла ў БДУ. Намі была зроблена сапраўды велізарная праца.

Хачу сказаць вялікі дзякуй усім членам сакратарыяту, якія сумленна працавалі, а таксама тэхнічнаму персаналу прыёмнай камісіі: лабарантам і метадыстам, якія займаліся абітурыентамі на месцах. І асобна хачу падзякаваць студэнтам з грамадскай прыёмнай камісіі з групы, адказнай за рэжым. Сярод апошніх у большасці сваёй студэнты фізфаку. Яны прыклалі максімум намаганняў для таго, каб правы абітурыентаў не былі нідзе і ні ў чым парушаныя.

**– Сапраўды, апытваючы абітурыентаў і іх бацькоў, мы пачулі нямала ўхвальных водгукаў пра дзейнасць прыёмнай камісіі БДУ. Асабліва тых, хто меў магчымасць параўнаць з сітуацыяй у іншых ВНУ. Тым не менш, некаторыя наракаюць на заўчаснае спыненне інфармавання пра сітуацыю з падачай дакументаў на пэўную спецыяльнасць...**

– Падобныя скаргі цалкам беспадстаўныя. У сваёй дзейнасці прыёмная камісія кіравалася пастановай Міністэрства адукацыі аб тым, што прыгаданая вамі інфармацыя павінна была выдавацца праз кожныя тры гадзіны. Мы міністэрскае патрабаванне нават перавыканалі. Па словах правяраючых, толькі ў БДУ інфармацыя выдавалася ў рэжыме он-лайн. Фактычна звесткі абнаўляліся кожныя 10–15 хвілін. Згодна з тым жа пастанаўленнем, апошняе абнаўленне павінна было з'явіцца ў 15.00. Мы ж па ўласным рашэнні вывесілі канчатковыя на той момант вынікі ў 16.00, чым далі магчымасць абітурыентам паглядзець на сітуацыю ў іншых ВНУ і параўнаць са становішчам у нас (прыём дакументаў ажыццяўляўся да 18.00). Пра такі парадак, між іншым, усе былі ў свой час папярэджаны. Больш за тое, на інфармацыйным экране ў холе галоўнага корпуса рознымі колерамі адзначаліся колькасць балаў, якая з'яўляецца дастатковай для паступлення на тую ці іншую спецыяльнасць, колькасць балаў, якая з'яўляецца памежнай, і колькасць балаў, якая з'яўляецца непрахадной.

Але ў апошні час сітуацыя з падачай дакументаў мяняецца вельмі хутка. Я была сведкай наступнай сітуацыі на гуманітарным факультэце (мы знаходзіліся там з прадстаўніком дзяржкантролю). Увявіце, сюды з 17.00 да 18.00, у апошнюю гадзіну да дэдлайну, на спецыяльнасць "менеджмент" на платную форму навучання падалі дакументы больш за 40 чалавек. Амаль тая ж сітуацыя склалася пры падачы дакументаў на бюджэтную форму навучання на фізічным факультэце, калі абітурыенты ў апошнюю гадзіну перакідвалі сюды заявы з ФПМІ, ФРіЭ, мехмата. Натуральна, у такім цэйтноце супрацоўнікі прыёмнай камісіі адно паспявалі запісваць прозвішчы ў журнал і больш нічога. А яшчэ ж трэба ўсё гэта апрацаваць, увесці даныя аб абітурыенце ў інфармацыйную базу! Пры ўсім жаданні прыёмная камісія не мела магчымасці давадзіць інфармацыю аб усіх пададзеных заявах у апошнюю хвіліну. Зразумела, і прахадны бал мог змяняцца ў параўнанні з сітуацыяй на 16.00. Мы ведаем аб выпадках, калі абітурыенты забіралі дакументы з адных факультэтаў (ВНУ) і падавалі на іншыя ў апошнія хвіліны, маючы надзею на паступленне. А атрымалася зусім іншая сітуацыя: на "новым" факультэце яны не прайшлі, а займелі б шанец на "старым" месцы, бо такіх "перабежчыкаў" аказалася багата. Вось такая латарэя.

Мы гатовыя рабіць усё магчымае для абітурыентаў і іх бацькоў, але спадзяёмся пры гэтым на адэкватнае разуменне сітуацыі і на цвярозы розум.

Гутарыў
**Сяргей ШАФАЛОВІЧ**
**Фота Аляксандра СНАПКА**

## ДАВЕДКА

Сёлета ў БДУ залічана 6096 студэнтаў. З іх на дзённую форму навучання – 4500; на завочную – 1596.

Конкурс абітурыентаў на дзённую **бюджэтную форму** навучання ўвогуле па ВНУ склаў 2,6 чалавека на месца.

Сярод факультэтаў прыродазнаўчага профілю найвышэйшы конкурс – 2,9 чалавека на месца – на біялагічным факультэце; сярод факультэтаў гуманітарнага профілю – на гуманітарным факультэце – 6,1 чалавека на месца.

На дзённую **платную форму** навучання конкурс у цэлым па ВНУ склаў – 1,2 чалавека на месца. Высокі конкурс – 2 і болей чалавека на месца зафіксаваны на біялагічным факультэце, на факультэце міжнародных адносін, а таксама ў Інстытуце тэалогіі імя святых Мяфодзія і Кірылы.

Сярод гуманітарных спецыяльнасцей найвышэйшы прахадны бал – 344 – зафіксаваны на спецыяльнасці «інфармацыя і камунікацыя» факультэта філасофіі і сацыяльных навук; сярод эканамічных спецыяльнасцей – 344 на спецыяльнасці «сусветная эканоміка»; сярод прыродазнаўчых спецыяльнасцей – 352 – на спецыяльнасці «камп'ютарная бяспека» факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі.

Сярод спецыяльнасцей з творчым конкурсам найвышэйшы прахадны бал – 40,7 – на спецыяльнасці «журналістыка (аўдыёвізуальная)».

Сярэдні бал атэстата студэнта дзённай бюджэтнай формы навучання – 8,9. Між тым на факультэце міжнародных адносін ён склаў 9,4, а ў Інстытуце бізнэсу і менеджменту тэхналогій – 9,7.

## МАНІТОРЫНГ

**Арцём Маркевіч (іншагароднi):** "Паступіў на геафак. Ніякіх складанасцяў. Даведаліся пра ўсё, што нас цікавіла, праз Інтэрнэт, па тэлефонах. Пазванілі – нам пра ўсё распавялі. Усё даступна, усё зразумела".

**Мама Валерыя Коласава (Пінск):** "Паступаў на «паліталогію». Напачатку спрабавалі ў "наргас", затым прыйшлі сюды. Больш даспадобы нам прыйшлася арганізацыя ўсяго працэсу ў БДУ. Уважлівае стаўленне з боку прыёмнай камісіі. Папярэдне я шматкроць званіла, і на ўсе пытанні мне вельмі ветліва і падрабязна адказвалі. Як параўналі гэтыя дзве ВНУ, сын заявіў, што хоча вучыцца толькі тут, што гэта яго месца. БДУ – сапраўды прэстыжная ўстанова. Узровень адразу відаць, нават па абітурыентах. Шкадую, што сама ў свой час не атрымала адукацыю ў Белдзяржуніверсітэце".

**Бацькі абітурыента (Гродзенская вобласць):** "Сын пайшоў на «бізнэс-адміністраванне». Нарэшце, усё склалася добра. Адзін недахоп – не было інфармацыі на апошнія дзве гадзіны падачы дакументаў. А трэба ж было ўсё ўзважыць і прыняць рашэнне. Так давялося дзейнічаць усляпую. Здараецца, што людзі з вышэйшымі баламі не праходзяць, а з ніжэйшымі застаюцца вучыцца. Чаму б не скінуць даныя а пятай ці а палове шостай гадзіны – было б не позна кудысьці яшчэ паспець. Што ж датычыць агульнай інфармацыі, у нас не ўзнікла ніякіх пытанняў. Загадзя ўсё было апублікавана і распаведзена".

**Андрэй Будук (Гродзенская вобласць):** "Здаваў іспыты ў Юр каледж. Матэматыка вельмі для мяне складаная – атрымаў усяго толькі "пяць". Бывікаў мусіць хапіць на платнае навучанне... Простая сярэдняя школа не можа падрыхтаваць да такіх іспытаў. Трэба альбо займацца з рэпетытарам, альбо наведваць курсы. У камісіі ўсё было нармальна. Кемлівыя людзі, дабразычлівыя".

**Марыя (іншагародняя):** "Мой выбар – біялагічны факультэт. Ніякіх цяжкасцяў. Замінка здарылася толькі з тым, як патрапіць у галоўны корпус БДУ, які з боку плошчы Незалежнасці недарэчна быў закрыты. Абходны шлях апынуўся занадта доўгім, і зарыентавацца атрымалася толькі з дапамогай дасведчаных людзей".

**Мама Святланы Аўдзеенка (Мінск):** "Паступалі на эканамічны. Ніякіх складанасцяў у адрозненне ад "наргаса" – там увогуле галаваломка ды гармідар. Першапачаткова хацелі ў БДЭУ. Але як пабегалі з факультэта на факультэт... у таўкатні пабывалі. Калідоры там меншыя, чым у БДУ. Па чатыры чаргі стаялі разам з мамамі, татамі і іншымі сваякамі. І ў спёку мы ў такіх умовах прастаялі 3,5 гадзіны. Калі я падышла да сакратара прыёмнай камісіі і прапанавала, як лепей арганізаваць чаргу, заўважыўшы, што тут неўзабаве будзе другая Няміга, мне адказалі, што гэта мы, бацькі, вінаватыя. Калі прыехалі сюды... – гэта ж неба і зямля! Спакойна, ціха, без псавання нерваў. Ды і на стэндах усё напісана. Да любога студэнта падыдзі – усё табе распавядуць і пакажуць. Вельмі спадабалася. Затым пагладзелі факультэт – і засталіся ў захапленні".

СТУДЭНЦКІ ІНТАРЭС

**Інтэрнаты БДУ гатовыя для засялення, якое адбываецца па графіку з 25 жніўня. Месцамі будуць забяспечаны каля 55% іншагародніх студэнтаў, якія маюць патрэбу ў жыллі, а гэта болей за 5,5 тыс. навучэнцаў.**

# ЗАСЯЛЕННЕ

Сёння ў БДУ восем дзеючых інтэрнатаў. Адзін інтэрнат – №7 – зачынены на капітальны рамонт і будзе ўведзены ў 2010 годзе. Акрамя таго, пачалося будаўніцтва інтэрната на 1030 месцаў у будучай студэнцкай вёсцы.

Наяўныя жылыя месцы размеркаваны прапарцыянальна паміж навучальнымі падраздзяленнямі. Асаблівая ўвага – першакурснікам. Для іх зарэзервавана 25% ад агульнай колькасці месцаў.

Рашэнне аб даванні інтэрната прымаецца камісіяй, якая складаецца з прадстаўнікоў дэканата і студэнтаў – прафсаюзных актывістаў, у адпаведнасці з крытэрыямі, у аснове якіх ляжаць пасляховасць і грамадская дзейнасць студэнтаў. Пры гэтым месцамі забяспечваюцца ўсе навучэнцы, якія маюць усталяваныя заканадаўствам ільготы ў прадастаўленні інтэрната.

Студэнты, якія не атрымалі месца ў інтэрнаце, могуць скарыстацца электроннай базай даных пра кватэры і пакоі, што здаюцца ў наём. Гэтыя абвесткі размешчаны на афіцыйным сайце БДУ (www.bsu.by) у раздзеле «СТУДЭНТЫ» і даступны ў рэжыме on-line. Акрамя таго, з 21 жніўня па 5 верасня з 8.30 да 18.00 у Студэнцкім гарадку будзе працаваць «гарачая тэлефонная лінія» (тэл. 328-52-79) па пытаннях засялення.

**Паводле інфармацыі Студгарадка**

# АДПАЧЫВАЕМ РАЗАМ!

**Студэнцкае жыццё не было б такім цікавым і насычаным, не пакідала б яркі след у сэрцы кожнага, хто перажыў гэтую цудоўную пару, каб яно складалася адно з вучобы. Калі развітацца з лянотай і дарэмна не губляць час, то яго хопіць і на граніт навукі, і на добры адпачынак у вольныя ад вучобы гадзіны. Тым больш, што ў родным універсітэце безліч магчымасцяў для такога адпачынку. У Студэнцкім гарадку, у прыватнасці, арганізацыя вольнага часу жыхароў інтэрнатаў – адзін з галоўных прыярытэтаў.**



У Студгарадку такі закон: жыве студэнт, заняты справай ён! А варыянтаў, каб рэалізаваць сябе, – мноства.

У фестывалі студэнцкай творчасці можа паўдзельнічаць любы студэнт, які жыве ў інтэрнаце, – у якасці гледача ці непасрэднага ўдзельніка. А гэта наступныя мерапрыемствы: вечар адпачынку "Віват, першакурснік!", святочныя вечарыны, прысвечаныя Дню заснавання БДУ, конкурс "Кулінарны паядынак", Студэнцкі кубак КВЗ, які праводзіцца напярэдадні Дня студэнта, фестываль студэнцкай песні "Срэбныя струны", шоу-конкурсы "Супермэн года", "Міс Вясна года", турніры па інтэлектуальных гульнях, выставы студэнцкай творчасці і шмат іншага. Апрача гэтага, кожны інтэрнат слаўны сваімі традыцыйнымі святамі і конкурсамі. У гэтым навучальным годзе студэнтаў чакаюць творчыя навінкі – Міжуніверсітэцкі фестываль нацыянальных культур і конкурс "Зорны час".

Для тых, хто не любіць марнаваць час і гатовы кожную вольную хвіліну выкарыстоўваць дзеля раскрыцця свайго творчага патэнцыялу, працуюць творчыя калектывы, гурткі і студыі: літаратурна-музычная гасцёўня "Натхненне", студыя сучаснага эстраднага танца "NON STOP", танцавальная каманда "JD" (інтэрнат №2, вул. Кастрычніцкая, 2), гурток сучаснага пашыву і дызайну адзення, творчая майстэрня-студыя (інтэрнат №6, вул. Кастрычніцкая, 10).

Хто поўны ідэй, мае выбітныя арганізатарскія здольнасці і хоча ўзбагаціць культурнае жыццё ў Студгарадку, тых чакаюць у Студэнцкай творчай лабараторыі (вул. Кастрычніцкая, 4, п. 104).

Хто заўсёды ў курсе ўсіх падзей, хто ўмее ці хоча навучыцца цікава расказваць пра іх, тых чакае Грамадская інфармацыйная служба (вул. Кастрычніцкая, 4, п. 109). Тут вы зможаце паўдзельнічаць у стварэнні газеты "Студэнцкі гарадок" і ў дзейнасці студэнцкай відэастудыі "SVS".

Тыя, хто адказна ставіцца да свайго здароўя і разумее, што падтрымання добрай фізічнай формы, умацаванне арганізму і высокай працаздольнасці патрабуе рэгулярных заняткаў спортам, могуць наведваць наступныя секцыі: аздараўленчай аэробікі (інтэрнат №1, вул. Свярдлова, 34 і інтэрнат №10, вул. Курчатава, 8), каратэ-до (у корпусе філалагічнага факультэта, вул. К.Маркса, 31), "Гімнастыка для ўсіх" (інтэрнат №4, прасп. Пераможцаў, 9), ушу, баскетбола, брэйк-данса (інтэрнат 10, вул. Курчатава, 8).

Хто не ўяўляе жыццё без спорту, для каго сапраўдны адпачынак – абавязкова актыўны, хто гатовы абараняць гонар свайго інтэрната ў розных спаборніцтвах і першынствах – тых Студгарадак запрашае паўдзельнічаць у спартакіядзе па 9-ці відах спорту, што ідзе круглы год. А калі хто жадае не толькі займацца спортам, але і прымаць непасрэдны ўдзел у арганізацыі спартыўна-аздараўленчай работы, таго чакаюць у Спартыўна-турысцкім клубе (вул. Кастрычніцкая, 4, п. 104).

Мы запрашаем вас, каб адпачываць разам, весела і актыўна!

**Вольга ЯРАШ,**
**нам. дырэктара Студгарадка па выхаваўчай рабоце**

## АБ'ЯВЫ

**ДУА "ІНСТЫТУТ БЕСПЕРАПЫННАЙ АДУКАЦЫІ" БДУ**

**аб'яўляе конкурс**
**на замяшчэнне пасадаў прафесарска-выкладчыцкага складу кафедры міжнацыянальных камунікацый:**

- старшы выкладчык – 0,5,
- выкладчык (руская мова як замежная) – 1,
- дацэнт кафедры – 0,5.

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: г. Мінск, вул. Маскоўская, 15, каб. 29, тэл. 222 82 68.

**ДУА "РЭСПУБЛІКАНСКІ ІНСТЫТУТ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ"**

**аб'яўляе конкурс**
**на замяшчэнне пасадаў:**

- дацэнта кафедры філасофіі і метадалогіі універсітэцкага адукавання;
- ст. выкладчыка маладзёжнай палітыкі (0,5 ст.).

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: г. Мінск, вул. Маскоўская, 15, аддзел кадраў, каб. 215, тэл. 200 91 07.

**НДУ "ІНСТЫТУТ ПРЫКЛАДНЫХ ФІЗІЧНЫХ ПРАБЛЕМ ІМЯ А.Н.СЕЎЧАНКІ" БДУ**

**аб'яўляе конкурс**
**на замяшчэнне пасадаў:**

- загадчыка лабараторыі оптыкі кандэнсаваных асяроддзяў па спецыяльнасці 01.04.05 (оптыка) – 1;
- навуковага супрацоўніка па спецыяльнасці 01.04.08 (фізіка плазмы) – 1.

Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: г. Мінск, вул. Курчатава, 7, тэл. 212 48 43.

**НДУ "НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧЫ ІНСТЫТУТ ПРЫКЛАДНЫХ ПРАБЛЕМ МАТЭМАТЫКІ І ІНФАРМАТЫКІ" БДУ**

**аб'яўляе конкурс**
**на замяшчэнне пасадаў:**

- навуковага супрацоўніка НДЛ матэматычных метадаў аховы інфармацыі – 1.

Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 4, каб. 702, тэл. 209 51 04.

# ШУКАЕМ ЗАРОБАК: ДЗЕ, ЯК І КОЛЬКІ?



***Адным з пытанняў, найбольш хвалюючых студэнтаў, асабліва малодшых курсаў, з'яўляецца магчымасць падзарабіць грошай у вольны ад вучобы час. Прапануем арыенціры, па якіх можна атрымаць дапамогу ў рэалізацыі гэтага жадання (а часам і жыццёвай неабходнасці).***

**Студэнцкі цэнтр занятасці** існуе ў БДУ даўно і дапамагае моладзі круглы год. Хочаце прысвяціць свой вольны час працоўнай дзейнасці, завітайце ў каб. 202 галоўнага корпуса, пацікаўцеся наяўнымі вакансіямі і запоўніце анкету з асабістымі пажаданнямі. Цэнтр занятасці адшуквае вакансіі з дапамогай Інтэрнэту і газеты "Работа для вас" (па дамове Цэнтр бясплатна атрымлівае частку тыражу выдання), абнаўленне базы вакансій адбываецца раз-два на тыдзень. Па спецыяльнасці ўладкавацца няпроста, бо, па-першае, студэнты яшчэ не маюць кваліфікацыі і досведу, а па-другое, у БДУ няшмат такіх вузкіх спецыяльнасцяў, як, скажам, сярод навучэнцаў БДЭУ ці БНТУ, што таксама мае значэнне пры падборы спецыялізаваных вакансій. Адбіваецца на характары працы і тое, што студэнтам патрэбны няпоўны працоўны дзень (трэба ж калісьці і на пары хадзіць, і рыхтавацца да іх). Таму самыя папулярныя прафесіі – афіцыянт, кур'ер, удзельнік рэкламных акцый, грузчык... Заробак можа вагацца ў залежнасці ад характару і аб'ёму працы, але не менш як 200–300 тысяч у месяц, прытым займееце працоўную кніжку і пачняце накопліваць вопыт. За год дзякуючы цэнтру занятасці такім чынам паправілі сваё матэрыяльнае становішча больш за 500 студэнтаў. Заўважце, што пік студэнцкай актыўнасці ў пошуку вакансій прыпадае на першыя месяцы восені, а таксама на люты і сакавік – калі вы прыйдзеце па працу ў іншыя месяцы, шансы вырастуць.

Штогод у БДУ ладзіцца **"Кірмаш вакансій"**, куды завітваюць у пошуку працоўнай сілы прадстаўнікі розных прадпрыемстваў. Сюды БДУ запрашае і супрацоўнікаў гарадскіх службаў занятасці, у якіх таксама вялікія базы вакансій. У гэтым годзе плануецца рэформа "Кірмашу" (арганізатары мяркуюць, што раздзяленне па факультэцкім прынцыпе прынясе больш плёну як студэнтам, так і работадаўцам) – сачыце за абвесткамі, зазвычай мерапрыемства адбываецца ў лістападзе альбо красавіку.

Знайсці працу можна і ў **Студгарадку**. Так, для прывядзення інтэрнатаў у парадак перад новым навучальным годам было задзейнічана 130 студэнтаў. Студгарадок падпісаў дамову з Мінскім гарадскім цэнтрам занятасці, адпаведна з якой студэнты атрымалі заробак па гарадскіх тарыфах. БДУ таксама не пакінуў па-за ўвагай сумленную працу сваіх навучэнцаў і дадаткова прэміраваў іх – за тры тыдні працаўнікам "набегла" прыблізна 250 тыс. руб. Немалаважны бонус – прыярытэтнае засяленне ў інтэрнаце.

**Факультэты** таксама пры патрэбе стараюцца дапамагчы сваім студэнтам знайсці працу. Прыкладам, на эканамічным факультэце найбольш актыўныя студэнты ўтвараюць так званае **грамадскае кадравае агенцтва**, якое ўзаемадзейнічае з буйнымі фірмамі прыватнага сектару, што даваляе студэнтам, па словах дэкана Міхаіла Кавалёва, "атрымаць не проста месца, а высокааплатную працу". А на журфаку спецыфіка навучання прадугледжвае цесны кантакт са СМІ, і часта вынікам практыкі становіцца не толькі ўзбагачэнне досведу студэнтаў, але і невялічкае папаўненне ў кішэні, прытым ніхто не замінае працягваць знаёмства з работадаўцам на працягу навучальнага года.

**Падрыхтавала**
**Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ**

# БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

**Засяленне ў інтэрнаты** – Народная газета" (08.08); БелТА (11.08); "Минский курьер" (16.08; 22.08); "Вечерний Минск" (18.08); naviny.by (22.08); "Рэспубліка" (22.08).

**Прыём у Юркаледж БДУ** – "СБ Беларусь сегодня" (01.08).

**Перамога студэнтаў БДУ ў міжнароднай студэнцкай матэматычнай алімпіядзе ў Балгарыі** – БелТА (31.07); "Знамя юности" (01.08; 08.08); "СБ Беларусь сегодня" (01.08; 07.08); "Настаўніцкая газета" (02.08; 12.08); "Вечерний Минск" (01.08); "Минский курьер" (05.08); "Рэспубліка" (06.08); "Звязда" (16.08).

**Пра генна-мадыфіцыраваныя прадукты разважае навуковы супрацоўнік лабараторыі генетыкі мікраарганізмаў біяфака БДУ Сяргей Жардзецкі** – "Рэспубліка" (19.08).

**Распрацоўкі біячыпаў, над якімі працуюць разам фізфак БДУ і Інстытут фізіялогіі НАН РБ** – "7 дней" (31.07).

**Кошт навучання** – "СБ Беларусь сегодня" (29.07); tut.by (26.07); БелаПАН; naviny.by (29.07); "Народная газета" (31.07); "Звязда" (06.08).

**Круглы стол у "СБ Беларусь сегодня" на тэму будучай АЭС у Беларусі** – "СБ Беларусь сегодня" (24.07).

**Рэспубліканская летняя навукова-даследчая школа ў "Брыганціне"** – БелТА (14.07); "Настаўніцкая газета" (19.07).

**Пра нанатэхналогіі прафесар кафедры фізікі паўправаднікоў і нанаэлектронікі БДУ Мікалай Паклонскі** – "Настаўніцкая газета" (15.07).

**Удзел беларускіх навукоўцаў у стварэнні Вялікага андроннага калайдэра** – "Настаўніцкая газета" (15.07).

**Прыёмная кампанія** – БелТА (24.07; 30.07); БелаПАН (27.06; 25.07; 29.07); Інтерфакс (25.07); naviny.by (10.07; 25.07; 29.07); tut.by (17.07; 29.07); news.open.by (25.07; 29.07); telegraf.by (26.07); "СБ Беларусь сегодня" (10.07; 17.07; 24.07; 26.07; 08.08); "Народная газета" (14.07; 17.07; 29.07; 05.08); "Рэспубліка" (16.07; 25.07; 31.07; 01.08; 05.08; 07.08); "Звязда" (25.07; 26.07; 30.07; 08.08); "Вечерний Минск" (10.07; 11.07; 25.07); "Минский курьер" (12.07; 02.08); "Белгазета" (28.07); "Труд" (31.07).

**Новыя распрацоўкі НДІ ПФП БДУ** – БелТА (08.07; 15.07); "Минский курьер" (17.07); "Гомельская праўда" (19.07).

**Працоўны семестр у БДУ** – БелТА (01.07); "Звязда" (05.07); "Настаўніцкая газета" (11.07); "Рэспубліка" (25.07); "Минский курьер" (11.07; 22.08).

**On-line канферэнцыя з рэктарам БДУ прафесарам Васілём Стражавым на сайце Белтэлерадыёкампаніі** – tvr.by; БелТА; БелаПАН; "СБ Беларусь сегодня"; naviny.by (27.06); news.open.by; telegraf.by (28.06).

**Спрэчкі па біяпаліве** – "Экономическая газета" (27.06; 25.07).

**Навукова-практычная канферэнцыя "Першы крок у навуку" на мехмаце** – "Рэпетитор" №7

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

# ШКОЛА ПЕРШАКУРСНІКА

***Учарашнія школьнікі сталі студэнтамі. Іншае жыццё, іншыя правілы. Каб вы не згубіліся ў плыні новай інфармацыі, прапануем вам у дапамогу своеасаблівы компас па універсітэце і яго структурах — “Школу першакурсніка”. З пытаннямі, якія вас цікавяць, звяртайцеся ў рэдакцыю газеты, і мы будзем рады вам дапамагчы.***

## СТАНЬ ЛІДАРАМ

***Падчас навучання ў БДУ маладыя людзі становяцца не толькі спецыялістамі ў абранай сферы: яны вучацца быць актыўнымі грамадзянамі сваёй краіны.***

**Студэнцкі саюз** падтрымлівае і развівае студэнцкае самакіраванне, ажыццяўляе міжнароднае моладзевае супрацоўніцтва, рэалізуе шматлікія крэатыўныя праекты для моладзі.

**Пярвічная арганізацыя грамадскага аб’яднання “Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі”** (з правамі раённага камітэта) падтрымлівае ініцыятывы, скіраваныя на выхаванне патрыятызму, пераемнасці пакаленняў, узаемадзейнічае з Саветам ветэранаў БДУ, спрыяе другаснай занятасці студэнтаў.

**Савет старастаў** інфармуе студэнтаў пра падзеі ў навуковым, грамадскім, спартыўным і культурным жыцці універсітэта, абмяркоўвае з кіраўніцтвам БДУ праблемы, якія ўзнікаюць у студэнтаў падчас навучання.

**Савет па матэрыяльным стымуляванні і аказанні матэрыяльнай дапамогі студэнтам і аспірантам** прымае рашэнні пра ўстанаўленне надбавак і размеркаванне матэрыяльнай дапамогі студэнтам і аспірантам універсітэта.

**Студэнцкі савет па якасці адукацыі** спрыяе павышэнню якасці адукацыі ў БДУ, адлюстроўвае пазіцыю студэнтаў да дзейнасці універсітэта ў гэтай сферы, робіць прапановы па арганізацыі навучальнага працэсу.

**Пярвічная прафсаюзная арганізацыя студэнтаў** абараняе прафесійныя, працоўныя, сацыяльна-эканамічныя правы і законныя інтарэсы сваіх членаў **(прасп. Незалежнасці, 4, галоўны корпус БДУ, каб. 203, тэл. 206-62-33).**

**По больш падрабязную інфармацыю звяртайцеся ва ўпраўленне выхаваўчай работы з моладдзю: прасп. Незалежнасці, 4, галоўны корпус, каб. 205, 207, тэл. 209-50-59, 209-52-61**

## ШУКАЕМ ТАЛЕНТЫ

**Народная харавая капэла.** Заняткі адбываюцца па панядзелках, серадах, пятніцах у 19.30 у аўд. 433 галоўнага корпуса БДУ.

**Народны фальклорны ансамбль “Тутэйшая шляхта”.** Заняткі адбываюцца па аўторках і чацвяргах з 17.00 да 19.00 у актавай зале філалагічнага факультэта (вул. К. Маркса, 31).

**Народны аркестр народных інструментаў.** Заняткі ладзяцца па панядзелках і серадах у 19.30 у аўд. 607 галоўнага корпуса БДУ.

**Клуб аўтарскай песні.** Заняткі праводзяцца па аўторках у 18.00 у аўд. 605 хімічнага факультэта.

**Народны фальклорна-этнаграфічны ансамбль “Неруш”.** Заняткі ладзяцца па аўторках і чацвяргах у 19.00 у галоўным корпусе БДУ.

**Народны ансамбль танца “Крыжачок”.** Заняткі адбываюцца па панядзелках, серадах і чацвяргах у 19.30 у спартыўнай зале галоўнага корпуса БДУ.

**Народны музычны тэатр-студыя БДУ “На філфаку”.** Заняткі ладзяцца па панядзелках, серадах, чацвяргах у 19.00 у актавай зале філалагічнага факультэта (вул. К. Маркса, 31).

**Народны тэатр-студыя “На балконе”.** Заняткі адбываюцца з аўторка па пятніцу ў 18.00 на 5-м паверсе галоўнага корпуса БДУ.

Акрамя таго, дзейнічаюць студыя эстраднай песні, вакальны ансамбль “Галант”, хор народнай песні выкладчыкаў і супрацоўнікаў “Родніца”, узорны дзіцячы ансамбль танца “Літарынка”, каманда КВЗ БДУ.

**Завітайце ва ўпраўленне па справах культуры БДУ: прасп. Незалежнасці, 4, каб. 211, тэл. 209-54-69**

## ДАПАМОЖА ПСІХАЛАГІЧНАЯ СЛУЖБА

У кожнага з нас бываюць перыяды, калі мы губляем упэўненасць, адчуваем непрыемныя перажыванні, стрэс. Не ладзяцца адносіны са сваякамі і блізкімі, узнікаюць праблемы ў кантактах з іншымі людзьмі. І не хапае ўласных сілаў, псуецца настрой, з’яўляецца адчуванне, што “разладзіўся механізм” і страчана жыццёвая раўнавага. Многія праходзяць праз гэта і працягваюць паўнацэнна жыць і працаваць. Пытанне толькі ў тым, колькі часу мы страцілі, колькі згубілі магчымасцяў, якія варыянты так і не змаглі рэалізаваць.

Нам неабходная дапамога іншых — тых, хто можа даць вартую параду. Такую дапамогу мы можам атрымаць, напрыклад, ад бацькоў, сяброў, старэйшых таварышаў. І вельмі часта гэтага дастаткова.

А калі няма магчымасці падзяліцца праблемай са знаёмымі людзьмі? Калі яны недаступныя ў патрэбны момант? Для гэтага існуюць спецыялісты-псіхолагі. Іх прафесійная дзейнасць грунтуецца на прынцыпах даверу, канфідэнцыйнасці, ананімнасці. Галоўная задача псіхолага — дапамагчы чалавеку самому справіцца з праблемай, выявіць і задзейнічаць уласны патэнцыял.

У Белдзяржуніверсітэце ўжо доўгі час працуе Псіхалагічная служба. Яе спецыялісты (а гэта дыпламаваныя педагогі-псіхолагі) ладзяць псіхалагічныя кансультацыі. Кожны з іх курыруе пэўны факультэт. І ў вас ёсць магчымасць звярнуцца да спецыяліста, які лепей ведае спецыфіку вашага факультэта, але вы таксама можаце звярнуцца і да любога іншага псіхолага – паверце, вам не адмовяць, а добразычліва і з разуменнем выслухаюць і дапамогуць.

Акрамя аказання псіхалагічнай дапамогі, спецыялісты ладзяць шмат іншых мерапрыемстваў, накіраваных на папулярызацыю псіхалагічнай інфармацыі, развіццё тых ці іншых навыкаў. Вы можаце наведаць:

— сацыяльна-псіхалагічныя трэнінгі па кантактах, развіцці дзелавых якасцяў, пашырэнні творчага патэнцыялу, мастацтве кіраваць часам, эфектыўным планаванні ды інш.;

— студэнцкі псіхалагічны клуб, дзе можна атрымаць інфармацыю па псіхалогіі, пагаварыць з аднадумцамі і цікавымі людзьмі і нават крыху адчуць сябе псіхолагам;

— клуб ролевых гульняў “Брама вымярэнняў”, дзе вы можаце кантактаваць у рэжыме ролевай гульні, з карысцю бавіць час, пазнаёміцца з новымі людзьмі;

— студэнцкую псіхалагічную бібліятэку, дзе спецыялісты падбяруць патрэбную вам літаратуру.

**Прыходзьце, мы чакаем вас: вул. Кастрычніцкая, 4, каб. 105, тэл. 206-60-37.**

**Руслан ПАПОК,**
**кіраўнік Псіхалагічнай службы БДУ**

## ПАХОД У БІБЛІЯТЭКУ

***Бібліятэка падчас навучання становіцца неад'емным памочнікам студэнтаў. Тут можна знайсці адказы амаль на ўсе пытанні. Каб праца ў бібліятэцы была эфектыўнай, варта ведаць, як гэты храм ведаў функцыянуе і якія паслугі прапануе.***

Студэнты кожнага факультэта БДУ адносяцца да аднаго з 9-ці абанементаў, дзе маюць права браць літаратуру з фонду бібліятэкі дамоў. Таксама яны могуць наведваць любую з 16-ці чытальных залаў, размешчаных амаль на кожным факультэце. Акрамя традыцыйных выданняў, у бібліятэцы ёсць доступ да паўнатэкставых і бібліяграфічных баз даных з навуковай і адукацыйнай інфармацыяй у чытальнай зале электронных інфармацыйных рэсурсаў па адрасе: прасп. Незалежнасці, 4, каб. 210.

Фундаментальная бібліятэка БДУ аказвае як традыцыйныя, так і дадатковыя паслугі. Сярод бясплатных – атрыманне неабходнай інфармацыі пра фонды бібліятэкі, карыстанне карткавымі і электронным каталогамі, картатэкамі, базамі даных, выдача ў часовае карыстанне ў чытальных залах і на абанементах друкаваных выданняў, навучанне студэнтаў пошуку інфармацыі ў базах даных, арганізацыя разнастайных выставаў, прэзентацый і інш.

З 2004 г. у бібліятэцы ўведзены платныя паслугі. Яны накіраваныя, з аднаго боку, на спрашчэнне працы студэнта ў бібліятэцы, з другога – на збор сродкаў для далейшага папаўнення фондаў. Гэта – выдача кніг з чытальных залаў на ноч або на 1 гадзіну; працягванне тэрміну карыстання ўзятай дамоў літаратуры, калі на яе няма попыту з боку іншых чытачоў; тэматычныя падборкі літаратуры бібліятэкарам па запыце студэнта; афармленне і рэдагаванне бібліяграфічных спісаў да навуковых, дыпломных, курсавых і іншых прац; ксеракапіраванне, сканіраванне і перфаперaплёт дакументаў і г. д. Праз службу электроннай дастаўкі дакументаў чытачы могуць замовіць электронныя копіі артыкулаў, адсутных у фондзе бібліятэкі.

ФБ БДУ займаецца таксама платнай перадачай спісаных з яе фондаў выданняў. У будынку філалагічнага факультэта (вул. К. Маркса, 31) у каб. 124 у будныя дні з 11 да 16 гадзін дзейнічае выстава-продаж мастацкай, філасофскай, філалагічнай, гістарычнай літаратуры і кніг на замежных мовах.

**Па дадатковую інфармацыю можна звяртацца на сайт ФБ БДУ www.library.bsu.by ці па тэлефонах 209-50-82 і 209-50-33.**



## ВІРТУАЛЬНЫ СВЕТ

Афіцыйны сайт БДУ – www.bsu.by. У сетцы БДУ існуе таксама ўнутраны агульнауніверсітэцкі сайт (http: // intranet.bsu), на якім службы універсітэта публікуюць аператыўную інфармацыю і дакументы, неабходныя ў тым ліку і студэнтам. У прыватнасці, на сайце ёсць інфармацыя пра медыятэкі. Медыятэкі – агульнауніверсітэцкія кампутарныя класы, прызначаныя для самастойнай работы студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў і супрацоўнікаў універсітэта. На сёння ў БДУ маецца пяць агульнауніверсітэцкіх медыятэк:

№ 1 - у вуч. корпусе па вул. Ленінградская, 16, аўд. 114;

№ 2 - у вуч. корпусе па вул. Курчатава, 5, аўд. 211;

№ 3 - у корпусе БДУ па вул. Рэвалюцыйнай, 11, аўд. 203;

№ 4 - у вуч. корпусе па вул. Кальварыйская, 9, чытальная зала бібліятэкі;

№ 5 - у вуч. корпусе па вул. К. Маркса, 31 (неўзабаве запрацуе).

Медыятэкі інтэграваныя ў карпаратыўную сетку БДУ, г. зн. у іх даступныя ўсе рэсурсы сеткі БДУ: навучальныя матэрыялы факультэтаў, сістэма e-University, бібліятэчныя рэсурсы (электронны каталог, сеткавыя паўнатэкставыя рэсурсы кампаніі Springer, EBSCO, Integrum-Techno, базы нарматыўна-прававых актаў "Эталон" і "КонсультантПлюс" і інш.) і Інтэрнэт. Кожны кампутар аснашчаны навушнікамі, мікрафонам, прыладай чытання DVD-дыскаў і USB-портамі. Палова кампутараў мае прылады запісу на дыскі CD і DVD, USB-кошыкі для работы з уласнымі хард-дыскамі, прылады для чытання картаў памяці. У кожнай медыятэцы ўсталяваны шматфункцыянальны сеткавы апарат (прынтэр, сканер, капір).



Працаваць можна ў любой з медыятэк. Абавязковая ўмова – наяўнасць імя карыстальніка (Login), зарэгістраванага ў сетцы БДУ. Для студэнтаў імя карыстальніка пазначана на пластыкавым студэнцкім білеце. На сайце http://intranet.bsu ў раздзеле "Выхад у Інтэрнэт для студэнтаў" апісваюцца тэхналогіі выкарыстання імёнаў карыстальнікаў і пароляў для студэнтаў у карпаратыўнай сетцы БДУ. Пры рэгістрацыі імені карыстальніка для студэнтаў пароль не задаецца. Студэнт самастойна павінен прызначыць пароль праз раздзел "Выхад у Інтэрнэт для студэнтаў", прычым зрабіць гэта трэба адразу пасля атрымання білета, каб гэтым імем не карысталіся іншыя.

Медыятэкі працуюць у дзве змены (да 21.00), а таксама ў суботу (да 19.00).

*Больш падрабязны графік працы і іншую неабходную інфармацыю пра медыятэкі і карпаратыўную сетку БДУ чытайце на сайце INTRANET.BSU*

**Фота Аляксандра СНАПКА**

## “ГАРАЧАЯ ЛІНІЯ” ДЛЯ СТУДЭНТАЎ

У БДУ дзейнічае “Студэнцкая гарачая лінія” (тэл. **209-54-16**). Яна створана для своечасовага рэагавання на канкрэтныя факты, кваліфікаванае вырашэнне студэнцкіх пытанняў і прапаноў па ўдасканаленні навучальна-выхаваўчага працэсу і іншых аспектаў дзейнасці ВНУ.

Акрамя таго, свае заўвагі, звароты і пытанні студэнты могуць адрасаваць рэктару універсітэта, апусціўшы ліст у скрыні “Пытанні рэктару”, якія стаяць у кожным навучальным корпусе.

## З УСМЕШКАЙ

*Альберт Эйнштэйн* гасцяваў у сваіх знаёмых. Пачаўся дождж. Калі Эйнштэйн збіраўся пайсці, яму прапанавалі ўзяць капялюш.

– Навошта? – адказаў геній. – Я ведаў, што будзе дождж, і менавіта з гэтай прычыны не адзеў капялюш. Бо ён сохне даўжэй за мае валасы. Гэта ж відавочна.

***

*Ісак Ньютан* адрозніваўся рассеянасцю, што, як вядома, гаворыць пра глыбокую засяроджанасць на пэўнай тэме. Таму з вялікім фізікам адбывалася мноства забаўных гісторый. Так, задумаўшы зварыць яйка, ён зрабіў гэта дакладна па ўсіх правілах. Памыліўся толькі ў адным: узяў у рукі яйка, а гадзіннік палажыў у кастрюлю.

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Газета зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 30 жніўня 2005 года

1 верасня 2008 года
Падпісана да друку 28.08.2008 г.
Зак. 902 . Тыраж 2000 экз. Ум. друк. арк. 1.
Надрукавана ў РУП “Выдавецкі цэнтр БДУ”
ЛП № 02330/0056850 ад 30.04.2004.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Сяргей ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Юлія ЛІТВІНАВА
Кампутарная вёрстка Аляксандра САЛАМАХІНА
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Бабруйская, 7, п. 411, тэл. 209-53-45,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by